**Пракапеня А.І.,**
*аспірантка кафедры*
*харавога мастацтва*

# ХАРАВОЕ САМАДЗЕЙНАЕ МАСТАЦТВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ
(па фестывалі 1997 г.)

У сучасны перыяд беларускае грамадства перажывае працэс нацыянальна-культурнага адраджэння. І вялікі ўплыў на абнаўленне і развіццё нашай беларускай культуры аказвае харавое мастацтва.

У гарадах і вёсках дзейнічаюць шматлікія хары, якімі кіруюць таленавітыя і адукаваныя людзі. Агляды, конкурсы, фестывалі мастацкай самадзейнасці сведчаць аб вялікім творчым росце калектываў, якія дасягнулі высокага ўзроўню выканальніцкага майстэрства.

Трэці рэспубліканскі фестываль народнай творчасці "Не старэюць душой ветэраны"— яскравае сведчанне невычэрпнасці духоўных крыніц беларускага народа, яго таленавітасці, самабытнасці. Ён пачаўся на Беларусі ў лютым 1997 г. і завяршыўся ў Мінску ў дні свята Вялікай Перамогі. У фестывалі ўдзельнічалі каля 20 калектываў харавой самадзейнасці, якія прадстаўлялі ўсе вобласці нашай рэспублікі.

Праграмы калектываў вельмі цікавыя, разнастайныя. Выконваліся класічныя творы, духоўная музыка, песні ваеннага часу, патрыятычныя песні, творы беларускага фальклору і г.д.

Харавы калектыў клуба "Подзвіг" Палаца культуры Брэстэнерга быў створаны 23 чэрвеня 1983 г. па рашэнні савета клуба "Подзвіг" ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Мастацкі кіраўнік — Пётр Вясна. У гурток увайшлі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны працы. 27 ліпеня 1993 года калектыву прысвоена званне "народны хор". Праз два гады яно было пацверджана. Калектыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначаны граматамі, іншымі ўзнагародамі. Хор праводзіць значную работу па падрыхтоўцы канцэртаў, гутаркі з насельніцтвам на патрыятычныя і маральныя тэмы. Праграма калектыву на фестывалі ўяўляла музычную кампазіцыю на тэму Вялікай Айчыннай вайны. Выступалі таксама салісты, жаночая група. Гучала музыка І.Дунаеўскага, А.Новікава, М.Захарава і інш.

Наступны ўдзельнік фестывалю — народны хор ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы Пастаўскага раённага Дома культуры. Створаны калектыў у 1980 г. У складзе хору — былыя кіраўнікі брыгад і партызанскіх атрадаў, простыя салдаты, медыцынскія работнікі, партызаны.

Доўгія гады хор заставаўся адзіным мастацкім калектывам такога кшталту ў Беларусі. У яго склад уваходзілі толькі ветэраны вайны (каля 50 чалавек). Рэпертуар хору складаецца ў асноўным з песень ваеннага часу і твораў сучасных кампазітараў.

Гродзенскую вобласць прадстаўляў народны хор ветэранаў вайны і працы "Памяць" Слонімскага раённага Палаца культуры.

Калектыў створаны ў лістападзе 1988 года. Хор узначаліў Аляксандр Клябанаў, які кіруе ім і сёння. Асноўны напрамак рэпертуарнай палітыкі хору — патрыятычныя песні. Выконваюцца таксама творы беларускага фальклору і сучасныя творы. У 1994 годзе калектыў атрымаў званне "народны". У праграме фестывалю была выкарыстана музыка Б.Фігоціна, Ю.Семянякі, Л.Захлеўнага. У выкананні праграмы прымалі ўдзел і салісты. Падрыхтоўка калектыву сведчыць аб высокапрафесійным узроўні; майстэрства хору знайшло прызнанне ў гледачоў.

Магілёўская вобласць прадставіла народны хор ветэранаў вайны і працы Магілёўскага НП "Вяснянка". Калектыў створаны ў 1992 годзе на базе клуба "Ветэран" Дома культуры. Яго арганізаваў і кіруе ім з першых дзен існавання Генадзь Обух. Хор мае акадэмічны напрамак. У яго рэпертуары больш за 40 твораў кампазітараў розных

краін і часоў. Сярод іх М.Блантэр, А.Аляксандраў, С.Тулікаў, М.Маўсесян, Л.Захлеўны. Калектыў — неаднаразовы дыпламант і лаўрэат усесаюзных аглядаў і фестываляў. Лепшыя ўдзельнікі народнага хору ветэранаў вайны і працы атрымалі дыпломы з прысваеннем звання “артыст самадзейнай народнай творчасці”.

Мінская вобласць была прадстаўлена народным хорам ветэранаў Вілейскага гарадскога Палаца культуры. Гэты калектыў створаны ў 1985 годзе. Званне “народны” атрымаў у 1991 годзе. Яго ўдзельнікі — рабочыя, урачы, настаўнікі, пенсіянеры — ветэраны вайны і працы. Трэба адзначыць высокую выканальніцкую культуру хору. У калектыве многа салістаў, ёсць дуэты, вакальныя гурты. Пры хоры створаны інструментальны ансамбль, які акампаніруе, выконвае творы мясцовага фальклору. Праграма вельмі цікавая і разнастайная: беларускія народныя песні, песні сваіх кампазітараў, беларускія канты. Творчае жыццё калектыву вельмі інтэнсіўнае. Ён шмат гастралюе, актыўна прымае ўдзел у разнастайных фестывалях, конкурсах.

Некалькі цікавых калектываў з Мінска таксама прынялі ўдзел у фестывалі.

Вакальны ансамбль “Баявыя таварышкі” Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў створаны ў студзені 1992 года па ініцыятыве ветэрана вайны Людмілы Ширкевіч. Ён аб’яднаў жанчын, на долю якіх выпала ліхалецце вайны. Сваю мэту яны бачаць у выхаванні патрыятычных пачуццяў у моладзі. Кожную з удзельніц калектыву можна назваць жанчынай-легендай, кожная мае высокія баявыя ўзнагароды. Калектыў выступае ў розных установах, часта сустракаецца з вучнёўскай аўдыторыяй. І зараз баявыя таварышкі спяваюць песні, дарагія для іх з таго, ваеннага, часу. Спяваюць яны таксама творы сучасных аўтараў і народныя песні.

Цяжка ўявіць, што хтосьці не ведае народнага вакальнага ансамбля ветэранаў вайны і працы “Памяць

сэрца". Ансамбль з'явіўся ў час святкавання 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першым яго кіраўніком быў таленавіты арганізатар Яўген Гардзей. Ансамбль удзельнічаў у шматлікіх фестывалях і аглядах самадзейнай творчасці. Ён унёс вялікі ўклад у развіццё патрыятычнай песеннай тэматыкі. Аб гэтым сведчаць граматы, узнагароды, дыпломы. За гады свайго існавання калектыў здзейсніў шмат цікавых задумак. У час фестывалю былі выкананы "Песня пра Заслонава" (муз. У.Алоўнікава) і дзве народныя песні. Мастацкі кіраўнік ансамбля — заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Я.Яравой.

Народны хор ветэранаў вайны і працы Мінскага аўтазавода — гэта калектыў, які нарадзіўся больш за 20 гадоў назад. Калектыў складаюць у асноўным жанчыны. У 1991 годзе хору прысвоена ганаровае званне "народны", якое ён пацвердзіў на фестывалі народнай творчасці "Сузор'е".

Удзельнікам фестывалю быў яшчэ адзін вельмі цікавы калектыў.Гэта народны хор ветэранаў вайны і працы Палаца культуры прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь. Ля вытокаў стварэння хору стаяў былы галоўны хормайстар Нацыянальнага тэатра оперы і балета Мікалай Прысяўкоў. 23 гады свайго жыцця ён аддаў пошукам і сцвярджэнню творчай індывідуальнасці калектыву. Сёння гэты калектыў узначальвае дацэнт Беларускай акадэміі музыкі Мікалай Хвісюк. У рэпертуары хору больш за 200 твораў. Адданасць харавому мастацтву, высокі прафесійны ўзровень, цярплівасць і чуласць у працы з людзьмі, любоў да беларускай песеннай творчасці дапамагаюць М.Хвісюку і яго калектыву ажыццяўляць свае творчыя мэты. Праграма хору ў асноўным складаецца з твораў ваеннай тэматыкі. Але асаблівую каларытнасць гэтай праграме надалі выступленні таленавітай спявачкі народных песень Паліны Івановай, а таксама чытальніцы Ірыны Яхнінай. Вершы, што выконваліся апошняй у ходзе канцэрта, арганічна перамяжоўваліся з музычнымі творамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У заключэнне хочацца адзначыць, што праграмы калектываў на фестывалі паказалі іх высокі прафесійны ўзровень. Усе праграмы былі насычаны рознымі песеннымі жанрамі. Фестываль праводзіўся на Беларусі ў трэці раз. Яму папярэднічалі падобныя святы, але яны праходзілі на гарадскім узроўні.

Уздым харавога мастацтва ў апошні час дазваляе ўбачыць, што з кожным годам павялічваецца колькасць калектываў харавой самадзейнасці і ўмацоўваецца, павышаецца рэйтынг прафесійных калектываў. Вялікая заслуга ў развіцці харавой самадзейнасці належыць калектывам, якія прадстаўляюць ветэраны вайны і працы.

Сёння самадзейныя калектывы цесна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, што ў значнай ступені ўзбагачае музычную культуру народа. Харавое мастацтва заўсёды будзе служыць сродкам аб'яднання, далучэння да эстэтычных і грамадскіх каштоўнасцей народа і, самае галоўнае, будзе ўплываць на фарміраванне асобы.

**Каттан Самер,**
*аспирант кафедры*
*педагогики социокультурной*
*деятельности*

## СОСТОЯНИЕ ХОРОВОЙ МУЗЫКИ В СИРИИ

Хоровое пение в музыкальной культуре Сирии, хотя и не занимает такого значительного места, как в европейских государствах, всё же является достаточно популярным, и прежде всего благодаря своим связям с народно-песенным творчеством.

Сирия ещё в период господства Османской империи была разделена на пять регионов, которые получили статус практически отдельных государств: южная часть (Эс-Сувейда, Хаврон) называлась Джибаль Аль-Дуруз, Дамаск



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ